# 8 САКАВІКА—МІЖНАРОДНЫ ЖАНОЧЫ ДЗЕНЬ

**ДАРАГІЯ ЖАНЧЫНЫ — СУПРАЦОЎНІЦЫ І СТУДЭНТКІ! РЭКТАРАТ, ПАРТКОМ, МЯСЦКОМ, КАМІТЭТ КАМСАМОЛА І ПРАФКОМ АД ШЧЫРАГА СЭРЦА ВІНШУЮЦЬ ВАС З ВЯЛІКІМ СВЯТАМ — МІЖНАРОДНЫМ ЖАНОЧЫМ ДНЁМ.**

**ЖАДАЕМ ВЫСОКАГА ТВОРЧАГА ГАРЭННЯ, ШЧАСЦЯ І РАДАСЦІ Ў СЯМ'І, ПЛЁННАЙ ПРАЦЫ Ў ГОНАР НАШАЙ РАДЗІМЫ.**

ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 8 (1120) ● Чацвер, 4 сакавіка 1976 г. ● ● Цана 2 кап. ● Газета выходзіць з 1935 г.



## ПА БДУ

На апошнім пасяджэнні парткома БДУ былі абмеркаваны пытанні: «Аб рабоце выкладчыцкай партыйнай групы механіка-матэматычнага факультэта». З дакладам па гэтаму пытанню выступіла партгрупорг факультэта С. А. Рудакоўская.

Па другому пытанню — «Аб рабоце з маладымі камуністамі на гістарычным факультэце» — выступіў сакратар партбюро гістфака І. В. Марчанка, з садакладам — Е. А. Мацвіенка.

* * *

1 сакавіка ва універсітэце адбылося пасяджэнне савета, на якім было ўсебакова абмеркавана пытанне «Вынікі першага семестра 1975 — 1976 навучальнага года і задачы па далейшаму ўдасканаленню вучэбна-выхаваўчай работы». З дакладам выступіў прарэктар па вучэбнай рабоце, прафесар А. Я. Малышаў.

* * *

Якім быць СНТ? Гэта пытанне было адным з асноўных на адбыўшымся 27 лютага савеце па НДРС. З дакладам аб перспектывах развіцця студэнцкага навуковага таварыства універсітэта выступіў старшыня савета СНТ Я. Ф. Ціткоў. Ён зачытаў праект новага ўстава СНТ, у якім, улічваючы ўзросшыя патрабаванні да выпускнікоў ВНУ, падкрэсліваліся асноўныя крытэрыі навуковай дзейнасці студэнтаў.

Аб становішчы ў СНТЛ універсітэта, якіх у БДУ зараз налічваецца шэсць, паведаміў кіраўнік СНТЛ Г. Н. Блінкоў.

На савеце была выбрана камісія па вывучэнню вопыту работы савета па НДРС ФПМ, які займаецца каардынацыяй усіх форм навукова-даследчай дзейнасці студэнтаў. Створаны ў парадку эксперыменту савет па НДРС ФПМ дае магчымасць прыступіць да распрацоўкі рэкамендацый арганізацыі саветаў па НДРС на факультэтах і кафедрах.

* * *

На хімфаку адбыўся камсамольскі сход супрацоўнікаў кафедры неарганічнай хіміі. На сходзе была выказана падтрымка закліку Сусветнага Савета Міру аб правядзенні новай кампаніі за спыненне гонкі ўзбраенняў. Сход адкрыў камсорг кафедры С. Мальчанка. У дакладзе «Барацьба за мір — важнейшая задача сучаснасці», з якім выступіў К. Каваленка, адзначаны выдатныя поспехі, дасягнутыя ў справе разрадкі міжнароднай напружанасці, заслугі СССР, іншых дзяржаў сацыялістычнага лагера ў ажыццяўленні Праграмы міру. Выступіўшыя на сходзе заклікалі супрацоўнікаў кафедры сваімі працоўнымі поспехамі ўнесці ўклад у справу ўмацавання міру.

Камсамольцы аднадушна прынялі зварот да ўсіх супрацоўнікаў універсітэта, членаў камсамольскай арганізацыі БДУ падтрымаць масавую кампанію.

## ДРУЖБА НЕ МАЕ МЕЖАЎ

23—29 лютага — Тыдзень савецка-чэхаславацкай дружбы, які праводзілі савет дружбы, грамадскія арганізацыі БДУ. Прысвечан ён быў дзвюм важным падзеям — адкрыццю XXV з'езда КПСС і 28-й гадавіне з дня ўстанаўлення народнай дэмакратыі ў Чэхаславакіі.

...Актавая зала ўпрыгожана кветкамі і плакатамі. На сцэне тры сцягі: СССР, БССР і сіне-бела-чырвоны сцяг Чэхаславацкай Сацыялістычнай Рэспублікі. На адкрыцці тыдня дружбы прысутнічаюць 10 чэхаславацкіх студэнтаў, якія навучаюцца на фізічным факультэце БДУ, выкладчыкі і студэнты універсітэта, прадстаўнікі адзінаццатага дзяржаўнага падшыпнікавага завода. Адзін за адным паднімаюцца на трыбуну выступаючыя. Словы віншаванняў, словы дружбы...

**Ян Малавец,** чэхаславацкі студэнт:

— Лютаўскія дні 1948 года для Чэхаславакіі адыгралі такую ролю, як кастрычніцкія 1917 года для Расіі.

**Кірыл Кананавіч Герман,** дэкан па рабоце з замежнымі навучэнцамі:

— Мне, былому воіну Савецкай Арміі, у гады другой сусветнай вайны давялося ўдзельнічаць у вызваленні Чэхаславакіі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У мяне да гэтай пары ў памяці тая вялікая дружба, той сардэчны прыём, які аказваў нам, савецкім воінам, чэхаславацкі народ у майскія дні 1945 года.

**Іса Давалі,** старшыня савета дружбы БДУ:

— Чэхаславацкае зямляцтва — адно з важнейшых звенняў нашай студэнцкай сям'і. Сёння мы віншуем чэхаславацкіх студэнтаў і жадаем ім поспехаў!

**Вера Галубцова,** намеснік сакратара камітэта камсамола адзінаццатага дзяржаўнага падшыпнікавага завода:

— Наша камсамольская арганізацыя падтрымлівае з чэхаславацкімі студэнтамі сяброўскія сувязі. Упэўнена, што з кожным днём гэтыя сувязі будуць умацоўвацца.

**Тонеў,** балгарскі студэнт:

— Мы, вашы балгарскія сябры, радуемся за ваш народ і сёння святкуем разам з вамі.

**Уля Вакнер,** стажор з ГДР:

— Жадаем чэхаславацкім студэнтам удач і поспехаў у жыцці.

**Буй Дзінь Кхой,** в'етнамскі студэнт:

— Мы ўсе упэўнены, што на радзіму вы вернецеся добрымі спецыялістамі, сапраўднымі будаўнікамі камуністычнага грамадства.

Чэхаславацкім студэнтам уручаюцца падарункі, кветкі. І, як вестка з дому,—паказ новага каляровага кінафільма ЧССР «Той дзень не загіне».

**С. УСЦІНОВІЧ.**

### ТЫДЗЕНЬ ГЕРМАНА-САВЕЦКАЙ ДРУЖБЫ

## ЗАПРАШАЕМ І ВАС

Вось ужо шосты месяц, як мы прыехалі ў Мінск. Мы — гэта 36 стажораў з ГДР. Мы прыехалі ўсяго на год, каб удасканаліць нашы веды па рускай мове, паколькі мы будучыя настаўнікі рускай мовы. Два курсы ўжо ззаду: мы займаліся ў Іенскім універсітэце імя Фрыдрыха Шылера.

Праз год перад намі будуць сядзець цікаўныя школьнікі, якім мы абавязаны даць правільнае ўяўленне аб жыцці ў Савецкім Саюзе, аб яго людзях, культуры, гісторыі, традыцыях, так што наша знаходжанне ў Мінску з'яўляецца важным перыядам вучобы. Нашы студэнты імкнуцца як мага больш даведацца аб краіне Леніна. Нам вельмі дапамагаюць нашы выкладчыкі.

У інтэрнаце мы жывём разам з савецкімі студэнтамі, з якімі нас звязваюць цесныя сяброўскія кантакты.

Разам з імі мы ўдзельнічаем у грамадскім жыцці універсітэта. Напрыклад, з першага па шостае сакавіка праводзіцца тыдзень інтэрдружбы, у падрыхтоўцы якога, акрамя нас, прымаюць удзел камсамольцы і філфака, і мінскага гадзіннікавага завода.

Запрашаем і вас!

**СТАЖОРЫ З ГЕРМАНСКАЙ ДЭМАКРАТЫЧНАЙ РЭСПУБЛІКІ.**



# СА СВЯТАМ, ЖАНЧЫНЫ!



## ЗА ДАБРАТУ ТВАЮ...

ПЕРШЫ, яшчэ ружовы ад сну прамень узыходзячага сонейка, заблытаўся ў траве. Каценька Жыляева, толькі ў гэтым годзе скончыўшая фельчарскае вучылішча, сустракала разам са сваімі аднакурснікамі, а цяпер ужо калегамі, першы ранак самастойнага жыцця. Выпускны вечар, цёплыя словы і пажаданні настаўнікаў, лёгкія крылы вальса і нясмелы позірк сябра, радасць і адначасова сум ад хуткага развітання з вучылішчам, выкладчыкамі, сяброўкамі— усё гэта засталося ззаду, у памяці сэрца. А наперадзе — яе дзявочыя мары, чыстыя і светлыя.

Каця не шукала лёгкіх дарог у жыцці. Яна выдатна ведала, што прафесія медыка не толькі патрэбная і неабходная, але і вельмі адказная, цяжкая. Але дзяўчына мела шчырае, шчодрае на любоў сэрца. Аднаго толькі не магла ўявіць сабе Каця, што так хутка, так нечакана хутка ёй прыйдзецца ўбачыць акрываўленыя бінты...

І вось ужо не Каценька, не Каця, а Кацярына Аляксееўна, малодшы лейтэнант медслужбы, разам з эвакуацыйным шпіталем рухаецца следам за фронтам. Пакалечаныя гарады, пакалечаныя людзі, пакалечаная родная зямля — усё гэта страшнай явай прайшло перад вачыма старшай медсястры шпіталя. Боль, смутак і вялізнае жаданне адпомсціць ворагу заселі ў сэрцы, бы асколак гранаты, прымушалі працаваць да цемнаты ў вачах.

Кацярына Аляксееўна не гублялася ні ў якіх абставінах. А хапала ўсяго. Былі начныя трывогі, спешная эвакуацыя параненых, бамбёжкі, артылерыйскія абстрэлы. Яе падбадзёрваючая ўсмешка слабым ценем адбівалася на тварах параненых, яе ласкавыя рукі прыносілі заспакаенне, знімалі боль. І гэтыя ж рукі дрыжачым почыркам пісалі пісьмы-завяшчанні... Толькі позна ноччу не магла стрымаць яна горкіх слёз. Аплаквала тых, каго не ўдалося выратаваць. А раніцай — зноў работа.

Са сваім шпіталем К.А. Жыляева прайшла доўгі шлях ад невялікай станцыі Вінаградава Маскоўскай вобласці да Усходняй Прусіі. Тут, у невялікім нямецкім гарадку, іх сустрэла доўгачаканая вестка — «Перамога!»

Мірнае жыццё забурліла, забіла паўнаводнай крыніцай. Неўзабаве Каця сустрэла таго, адзінага... Жылі дружна, ладна, траіх дзяцей узгадавалі. Многа радасці дарылі яны бацькам. І раптам — гора: памёр муж. Засталася адна і трое дзяцей школьнага ўзросту. Апускаліся рукі, не хапала часу на ўсё. Трэба і ў школу выправіць, апрануць, пакарміць і на работу паспець. І яна паспявала.

У паліклініцы БДУ Коласава (гэта яе прозвішча па мужу) працуе з 1971 года. Таварышы выбралі яе членам прафбюро, адказнай за работу культмасавага сектара. Кацярына Аляксееўна — сапраўдны таварыш, якога паважаюць у калектыве. А яшчэ яна добрая маці. Яе шчасце, яе бясконцыя клопаты, яе надзея і светлая радасць — гэта яе дзеці. Старэйшы, Станіслаў, — кандыдат тэхнічных навук, дачка Людміла стала ўрачом, а малодшая, Тамара, заканчвае універсітэт. Трэба мець нямала мужнасці, мацярынскага цярпення, педагагічнага такту і нават проста жыццёвага вопыту, каб адной вывесці дзяцей «у людзі», выгадаваць іх добрымі і чулымі.

Але яна не толькі маці сваіх дзяцей, а і ўсіх студэнтаў. Любоў да людзей кіруе ёю, калі яна кожнаму хвораму цярпліва тлумачыць, да каго і калі яму трэба звярнуцца, як прайсці ў аптэку ці гарадскую паліклініку.

...Я зайшла сюды ў самы разгар рабочага дня. Уразіла: рабочае месца Кацярыны Аляксееўны нагадвала своеасаблівы штаб.

Вось так, нечакана д. сябе, Коласава аказалася зноў на баявым пасту.

Загадчыца паліклінікі М. І. Цырульнікава, прадстаўляючы мне Кацярыну Аляксееўну, сказала:

— Надзвычай добрасумленны, шчыры на працу чалавек. А наконт яе работы адно магу сказаць: калі Коласавай не было некалькі дзён, мы тут з ног збіліся...

Мне асабіста хочацца дадаць да гэтых слоў аб сціплай, прыгожай душой жанчыне:

— Вялікае дзякуй!

**Т. ВОЛКАВА.**

## ДЗЯЎЧЫНА З ВОСТРАВА СВАБОДЫ

ХВІЛІН дзесяць пасля званка мне прыйшлося чакаць каля дзвярэй аўдыторыі. Аказваецца, дзяўчаты віншавалі сваіх хлопцаў з Днём Савецкай Арміі. Каб не траціць часу, звяртаюся да дзяўчыны, якая стаіць побач са мной.

— Скажыце, калі ласка, вы ведаеце студэнтку з Кубы Раісу Фурэт?

— Так, мы займаемся ў адной групе.

— Што вы можаце сказаць аб ёй?

— Што магу сказаць... Выдатная дзяўчына. А вось, дарэчы, і яна сама.

Да нас падышла смуглявая брунетка, ветліва ўсміхаючыся, і скаванасць першых хвілін знікла. Так мы і пазнаёміліся.

Мяне вельмі цікавіла пытанне, чаму ў кубінскай дзяўчыны рускае імя.

— Мая маці вельмі любіць музыку, што характэрна для нас, кубінцаў, — тлумачыць Рая. — Аднойчы яна пачула ў адной рускай песні, якая гучала па радыё, імя Рая. Яно ёй спадабалася, і першай сваёй дачцы маці дала гэта імя.

Раісе 22 гады. Нарадзілася ў Сант'яга дэ Куба. Там жа вучылася ў спецыялізаванай матэматычнай школе. Пасля паспяховага заканчэння ў ліку лепшых Рая была накіравана ў Савецкі Саюз для далейшай вучобы. Два з палавінай года яна займалася ў Баку і вось зараз — у нашым універсітэце.

— Першы час вельмі сумавала па Кубе. Цяжка было звыкнуцца з мясцовым кліматам: у нас жа не бывае снегу. Але цяпер у мяне шмат сяброў сярод савецкіх студэнтаў, і яны мне не даюць сумаваць.

У мінулым годзе мы ездзілі ў лагер працы і адпачынку, які знаходзіцца ў Віцебскай вобласці, убіралі буракі. Было так здорава!

Факультэт фізікі, дзе займаецца Рая, не з лёгкіх. Шмат часу затрачваецца на падрыхтоўку, але дзяўчына паспявае пабываць і на новых выстаўках, у карцінных галерэях. Рая любіць мастацтва.

— У Ленінградзе я тры разы хадзіла ў Эрмітаж і кожны раз з новым пачуццём акуналася ў свет прыгожага. А наогул у Савецкім Саюзе ёсць што паглядзець, чаму навучыцца. Мы — маладая сацыялістычная краіна, нам многа яшчэ прадстаіць зрабіць. 17 снежня 1975 года ў нас адбыўся І з'езд Камуністычнай партыі Кубы. Гэта вялікая і радасная падзея для кубінскага народа.

Многа яшчэ гаварыла Рая аб сваім цудоўным востраве Свабоды. А ў канцы сказала:

— Хутка Міжнародны жаночы дзень. У гэты дзень нашы жанчыны будуць пець, танцаваць, смяяцца. Будзе шмат кветак. І ад імя ўсіх кубінскіх жанчын я хачу пажадаць жанчынам Савецкага Саюза мірнага неба, яркага сонца, шчасця і любві.

**Л. САДОЎСКАЯ.**

## СПРАВА ЎСЯГО ЖЫЦЦЯ

КАЛІ мы ўвайшлі ў кабінет дырэктара бібліятэкі Ірыны Уладзіміраўны Арэхоўскай, яна аб нечым дзелавіта размаўляла па тэлефоне. Ласкава ўсміхнулася нам, кіўком галавы запрасіла сесці.

Яна пачынае гаварыць, і я міжволі заслухоўваюся. Па-першае, Ірына Уладзіміраўна вельмі цікава расказвае, а, па-другое, вельмі цікава і тое, аб чым яна расказвае. Вось толькі аб сабе яна не любіць гаварыць.

— Аб сабе? Цяжка, вельмі цяжка. Вось каб пра нашу бібліятэку...

Я слухаю і думаю, што гэта добра, калі чалавек улюбён у сваю справу. Дзеля любімай работы і клопаты прыемны. З якім захапленнем гаворыць Ірына Уладзіміраўна аб тым, што павялічваецца колькасць чытачоў, што фонд бібліятэкі зараз складае 1.300.000 кніг, што расшырана плошча кнігасховішча. І я разумею, што ўсё гэта прайшло праз яе рукі.

Ужо 6 гадоў працуе ў нашым універсітэце Ірына Уладзіміраўна Арэхоўская. А бібліятэчнай справе наогул яна аддала 20 гадоў. Вучылася спачатку ў Мінскім бібліятэчным тэхнікуме, потым скончыла бібліятэчны інстытут імя Н. К. Крупскай у Ленінградзе.

— Усё маё жыццё — гэта праца ў бібліятэцы,— усміхаецца Ірына Уладзіміраўна.

Так, сапраўды. І праца Ірыны Уладзіміраўны адзначана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалём ВДНГ СССР, знакам «Выдатнік культуры СССР». А калектыў, які ўзначальвае Ірына Уладзіміраўна Арэхоўская, ужо некалькі гадоў займае ў сацыялістычным спаборніцтве першае месца.



Калі я пытаю яе аб грамадскай рабоце, яна адказвае:

— Лепш не пытайцеся. Яе столькі, што ледзь паспяваю. Я з'яўляюся намеснікам старшыні Рэспубліканскай навукова-метадычнай бібліятэчнай камісіі пры Мінвузе БССР і членам такой жа камісіі пры Мінвузе СССР.

У 1970 годзе Ірына Уладзіміраўна стала членам партыі.

— Я заўсёды лічыла, што трэба рабіць так, як падказвае ўласнае сумленне. Калі ж стала членам КПСС, пачала адносіцца да ўсяго яшчэ больш патрабавальна.

Наперадзе ж у дырэктара бібліятэкі шмат спраў. Ірына Уладзіміраўна расказвае, што хоча ўстанавіць канвеер у кнігасховішчы, пнеўматычную пошту на заказ кніг. А галоўная мара — механізацыя працы бібліятэкараў.

Дома яе заўсёды нецярпліва чакаюць. І Ірына Уладзіміраўна спяшаецца ўбачыць сваіх дачок, пагаварыць з імі.

— А часам трэба і на лыжах пахадзіць, і ў тэатры пабываць. Але вы, напэўна, не паверыце, галоўнае для мяне і ў вольны час — кнігі і зноў кнігі.

Што ж, калі захапленне перарастае ў справу жыцця, значыць, чалавек знайшоў сябе. І прыклад таму жыццё і праца самой Ірыны Уладзіміраўны Арэхоўскай.

**Т. ШЧОГАЛЬ.**

Фота **С. Шыдлоўскай.**



# ВЯЛІКІ МАЙСТАР СЛОВА

**5 сакавіка — 80 год з дня нараджэння (1896) Кандрата Крапівы, беларускага савецкага пісьменніка.**

Кандрату Кандратавічу Крапіве споўнілася 80 год. За гэты час вельмі многа зрабіў беларускі пісьменнік. А галоўнае, як зрабіў.

Спытайце любога вясковага хлапчука пра дзеда і бабу, і ён абавязкова з задавальненнем прадэкламуе два першыя радкі з вядомай байкі Крапівы «Дзед і баба».

Вядома, ён не ведае аўтара, але недзе пачуў байку, яна яму спадабалася.

У дзяцінстве і я спяваў верш пра дзеда і бабу, а калі падрос, мяне зацікавіла, хто ж напісаў гэтыя радкі. Так адбылося маё знаёмства з Кандратам Крапівой. Спачатку чытаў толькі байкі.

Блізкасць вясковага побыту, актуальнасць тых праблем, якія ставіў байкапісец у сваіх творах, зразумелая і блізкая мова — усё гэта запаланіла маю душу. Усё, што было ў саўгаснай, школьнай бібліятэцы, я прачытаў да апошняга слова.

Бязлітасны, здзеклівы, знішчальны смех у адносінах да гарлахватаў, гультаёў, ворагаў Савецкай улады. Няцяжка ўбачыць, што Кандрат Кандратавіч, як вялікі майстар слова, ва ўсёй паўнаце скарыстаў народную творчасць. Так можа пісаць толькі той чалавек, які шчыра любіць свой народ, сваю Радзіму.

Пісаць пра тое, што Крапіва паставіў беларускую байку ў мастацкіх адносінах на новую, больш высокую ступень, я думаю, не трэба, пра гэта напісана шмат. Трэба толькі адзначыць, што байка, сатырычны верш—гэта той фундамент, на якім выраслі драматычныя творы, апавяданні, раманы пісьменніка.

Хочацца яшчэ спыніцца на драматургіі Крапівы, а іменна на сатырычнай камедыі «Хто смяецца апошнім». Я закрыў апошнюю старонку гэтага твора і яшчэ раз упэўніўся, што так пісаць мог толькі Кандрат Кандратавіч. З гэтага часу маё жыццё набыло зусім іншы сэнс, або, лепш, змест. Мой духоўны скарб папоўніўся новымі жыццёвымі вобразамі. «Канец дружбы», «Партызаны», «Проба агнём», «Мілы чалавек», «Пяюць жаваранкі», «Зацікаўленая асоба», «Людзі і д'яблы», нарэшце «Брама неўміручасці» — выдатныя творы Кандрата Крапівы, сапраўднага мастака. Больш сарака год пісьменнік працуе над п'есамі. З-пад яго пяра выходзяць творы надзвычай жыццядзейныя і баявітыя.

Кандрат Кандратавіч Крапіва — народны пісьменнік БССР, акадэмік Акадэміі навук БССР. У гэтым годзе ўвесь народ віншаваў Кандрата Крапіву з высокай узнагародай: яму прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы.

**Алесь ГАЙДУК, студэнт I курса журфака.**



*Лабараторныя заняткі па аналітычнай хіміі ў студэнтаў I курса 5 групы біяфака.*

Фота Т. Петрашкевіч.

# ДАВЕР'Е АПРАЎДАЦЬ ПРАЦАЙ

Куратар. Добра знаёма гэтае слова кожнаму студэнту. І мабыць кожны студэнт разумее, што жыццё групы залежыць у нейкай ступені іменна ад гэтага чалавека. Гаворачы аб працы куратара, мне вельмі хочацца падзяліцца ўражаннямі маіх сустрэч з Ларысай Арцёмаўнай Ісачанкавай, куратарам 9-й групы II курса фізічнага факультэта і куратарам падрыхтоўчага аддзялення фізікаў.

На фізічны факультэт Ларыса Арцёмаўна прыйшла зусім нядаўна. Спачатку Віцебскі педінстытут, потым аспірантура нашага універсітэта, а сёння яна загадчык кафедры агульнай фізікі...

Ларысу Арцёмаўну можна аднесці да тых людзей, якія лёгкага не чакаюць, а цяжкага не баяцца, таму і згадзілася яна несці вялікую адказнасць ужо з самага пачатку сваёй дарогі, стала курыраваць падрыхтоўчае аддзяленне фізікаў. Згадзілася таму, што куратар — гэта чалавек, які поўнасцю жыве студэнцкім жыццём, а хто не марыць, каб студэнцкія гады зноў паўтарыліся...

— Спачатку вельмі хвалявалася, — гаворыць Ларыса Арцёмаўна, — а раптам яны не зразумеюць мяне, не пойдуць насустрач, маладыя ж вельмі.

Сапраўды, у кожнай справе першыя крокі заўсёды самыя цяжкія, але галоўнае ў такі момант не сказаць самому сабе, што табе цяжка, а наадварот, падбадзёрваць сябе тым, што сапраўдная радасць прыходзіць толькі пасля сапраўдных цяжкасцей. І гэтая радасць прыйшла! Сёння 9-я група — адна з лепшых на фізічным факультэце, а Ларыса Арцёмаўна прадстаўлена да ўзнагароджання значком «Пераможца сацыялістычнага спаборніцтва».

Проста і лёгка размаўляць з Ларысай Арцёмаўнай. І нельга не заўважыць, што гэта чалавек, які больш за ўсё любіць расказваць не пра сябе, а пра жыццё сваіх выхаванцаў. Шмат расказала яна аб старасце групы Васілю Чаеўскім, старасце падрыхтоўчага аддзялення Валерыю Блішчу, членах камітэта камсамола Галіне Траянавай, Таццяне Кудзінай і многіх іншых.

Прыпомніліся словы намесніка дэкана фізічнага факультэта Алега Аляксандравіча Чупрыгіна, які сказаў:

— Ларысу Арцёмаўну вельмі выдзяляе яе чалавечая сціпласць і прастата.

Сціпласць і прастата... Чалавек працуе побач з іншымі, такімі ж, як ён. Вельмі важна, што думаюць людзі аб тваёй працы, аб тваіх адносінах да яе, аб табе самім, бо, як кажуць, збоку лепш назіраць за чалавекам.

Прафорг групы фізікаў падрыхтоўчага аддзялення Сяргей Страптовіч сказаў: «Гэта чалавек вельмі просты і адкрыты ва ўсім. Ён заўсёды, нават у самым безвыхадным становішчы, знойдзе выйсце. Такому чалавеку проста нельга не ісці насустрач». Студэнт Віктар Мельнічук: «Ларыса Арцёмаўна кожны свой матэрыял тлумачыць з душою, ад усяго сэрца, і, мабыць, таму самае цяжкае засвойваецца як зусім лёгкае. У патрэбную хвіліну для кожнага з нас яна знойдзе цёплае слова...».

**Н. КУДЛАСЕВІЧ.**

## СТУДЭНЦКАЯ РЭЦЭНЗІЯ

# ПАЧАТАК ШЛЯХУ

Успамінаецца леташняя літаратурная сустрэча на філалагічным факультэце БДУ. Разам з Рыгорам Барадуліным выступаў амаль невядомы студэнтам «апошняга прызыву» малады паэт Алесь Камароўскі, які, дарэчы, сам скончыў гэты факультэт. З таго часу прайшло крыху больш года. І вось у руках першая кніжка паэта — яго дэбют, яго пачатак, заяўка ў літаратуру.

Які ж гэты пачатак? Што «сее» ў душах чытачоў малады аўтар, што абяцае яго паэтычны старт? Гартаем старонкі. І адразу ж, у першым вершы, сімвалам пераемнасці пакаленняў, непарыўнай сувязі былога і будучага паўстае воблік самога аўтара («Аўтапартрэт»):

Пільна ўглядаюся...
воблік акрэслены
стыне
Бацькі майго
праз мяне
ў маім будучым
сыне.

Чытаючы вершы Алеся Камароўскага, пераконваешся, што многія радкі і строфы напісаны ўмелай і натхнёнай рукой. У іх няма празмернай метафарычнасці, нагрувашчвання ўсемагчымых вобразных асацыяцый. Гэта сціслыя, строгія, канкрэтныя. Усё проста, ясна і шчыра. Як у вершы «Дзяўчынка»:

А дома—смачна есца,
А дома—смачна
спіцца...
Кранецца поўнач
з месца—
Прыгожа вельмі спіцца.
Дзяцінства пралецела
Па ўтоптаным
гасцінцы
Дзяўчынкаю ў белай
Раскрыленай
хусцінцы.

Альбо «Смерць бацькі». Усё тут перажыта аўтарам, і чытача адразу ж працінае наскрозь вострая чалавечы боль страты.

Нібы рачной прахаладай - свежасцю ад самой «маленькай Ловаці», выпраменьваецца светласць і чысціня ад радкоў верша «Ёсць рачулка»...

Добрыя па сваёй задуме вершы, прасякнутыя рамантыкай працоўных будняў. Гэта «Нараджэнне», «Не для рамантыкі кніжнай», «Цыркулярка», «На цэменце», «Каваль» і іншыя. Безумоўна, да лепшых твораў кніжкі можна аднесці і верш «Соль», сюжэт якога ўзяты з самой гісторыі. Некалькімі штрыхамі паэт стварае яркую карціну далёкага і жахлівага мінулага з часоў князёў Радзівілаў.

Асобнае месца ў паэзіі А. Камароўскага займаюць вершы, прысвечаныя родным мясцінам, — радзіме вялікага песняра Якуба Коласа. Малады аўтар, які нарадзіўся і правёў дзяцінства на славутай Мікалаеўшчыне, нібыта экскурсавод, вядзе чытача па слядах народнага песняра.

Уражвае верш «Зямля мая», які аўтар прысвяціў Коласу. У вершы ўдала, на маю думку, скарыстаны вершаваны размер «Новай зямлі».

А дзядзька «Юзікшаляніца»—
Гатоў яму я
пакланіцца—
Падкруціць хватка
свае вусы:
— Не ўсе звяліся
беларусы!
На вёску родную
пакажа:
— Ды жыць тут—
шчасце, а не гора,
А маладых вось цягне
ў горад.
Яно, вядома,
не прывяжаш...

У пасляваеннай паэзіі вайна асацыіруецца часцей за ўсё з рэхам, якое ніяк не заціхае ў сэрцах людзей. Вайна не закранула непасрэдна аўтара «Пачатку». Але яна жыве ў памяці пакаленняў, ажывае ў свядомасці моладзі. Малады паэт помніць усё тое, чаго не было з ім, але здарылася з яго папярэднікамі, бо на ўсёй шматпакутнай зямлі Беларусі шумяць партызанскія лясы — «помнікі мёртвым і жывым», тыя самыя лясы, дзе нарадзіліся дзеці ў дзень смерці сваіх бацькоў, дзеці, якія выраслі. Гэта ў іх не гасне надзея: «А можа яшчэ жывы?». Гэта яны ў дзень шлюбу ідуць на плошчу Перамогі, каб аддаць даніну павагі і любві тым, хто заваяваў ім шчасце, сваім бацькам, якія ішлі ў бой

...З накіпелай помстай,
З надзеяй простай
Перамагчы, забыўшыся
пра сябе
У барацьбе.

Гэта радкі з верша «Дзень нараджэння». І як своеасаблівы працяг іх—вершы «Памяць» і «Паклон».

Кніжка ў цэлым удалася. Паэтычны пачатак Алеся Камароўскага ў літаратуры абяцае шмат цікавага і арыгінальнага. Аднак зборнік не пазбаўлен і пэўных недахопаў. Нават у добрых вершах сустракаюцца радкі, якія не нясуць паэтычнай нагрузкі («Не для рамантыкі кніжнай», «Нараджэнне», «Дзень нараджэння»). У прыватнасці, у вершы «Аўтапартрэт», якім адкрываецца зборнік, ёсць не зусім сціплыя мясціны самахарактарыстыкі паэта: «Лоб — узаранае думкамі шчырымі поле...», «Вочы—азёры бяздонныя», «Срэбра валос узышло» і г. д. Не заўсёды яшчэ А. Камароўскі ў згодзе са словам, з жыццёвым вобразам. «Неба запруджвае тысячы вок», «Сонца цыркулярным кругам стэп раскроіць папалам», «З першай палучкі месяца келіх кулялі» і г. д.). Сустракаюцца і прамыя вобразныя запазычванні ў іншых паэтаў — А. Куляшова, Р. Барадуліна.

Што ж датычыць верша «Паклон», то, на маю думку, для раскрыцця такой сур'ёзнай тэмы павінен быць крыху іншы зачын, іншы размер, іншы рытм, а не чатырохстопны харэй у духу старавераўскага гумарыстычнага твора «Скрыпка і бубен». Чамусьці здаецца, што гутарка ў вершы пойдзе не аб паклоне маладажонаў загінуўшым, а пра нешта радасна-жартаўлівае.

...Закрыта апошняя старонка кнігі. Паэтычны шлях пачаўся. Няхай жа ён прыводзіць да новых даляглядаў.

**Я. МАЛЬЧЭЎСКАЯ, член гуртка гісторыі і тэорыі беларускай літаратуры.**

# А ТЫ ЎМЕЕШ АДПАЧЫВАЦЬ?

«Лішняга білеціка няма?» —адразу некалькімі галасамі спынілі нас незнаёмыя хлопцы, якія тоўпіліся ля ТЮГа. На жаль, білета не аказалася, і пазней мы нават пашкадавалі тых хлопцаў...

У гэты вечар у Тэатры юнага гледача гаспадарылі студэнты гістфака Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна. Яны ўмеюць не толькі добра вучыцца і працаваць, але і цікава адпачываць. Вядома, не абышлося і без гасцей. Імі сталі студэнты Белдзяржкансерваторыі імя А. В. Луначарскага і МДПІ замежных моў. Прыйшлі на вечар і свае, універсітэцкія рабяты.

Прыемна было чуць добрыя словы аб жыцці студэнтаў гістарычнага факультэта. Вось усяго некалькі лічбаў. Па выніках мінулага навучальнага года камсамольская арганізацыя гістфака заняла I месца ва універсітэце і II—па спорту. Паспяховасць зімовай экзаменацыйнай сесіі склала 97 працэнтаў. Як бачыце, справы нядрэнныя. Вялікая група камсамольскіх актывістаў была ўзнагароджана граматамі рэктарата, каштоўнымі падарункамі, грашовымі прэміямі. Сярод лепшых — Л. Шульга, І. Хусаімаў, В. Дубініна, Т. Савачкіна, Я. Слуцкі і многія іншыя. Гэта — авангард, тыя, на каго раўняюцца, кім ганарацца.

А вечар адпачынку працягваўся. У поўным сэнсе слова ён адпавядаў сваёй назве. Вось на сцэну выйшлі дзве дзяўчынкі, будучыя музыканткі. Ледзь прыкметны ўзмах смычка — і над залай паплылі чароўныя гукі бетховенскай «Санаты № 5». Напэўна, кожны па-свойму разумеў мелодыю скрыпкі, але, безумоўна, ніхто не застаўся абыякавым да яе.

Шмат гарачых воплескаў дасталася спявачцы Галіне Баян. Натхнёна, з пачуццём народнага каларыту, выканала яна песні: «Не за вочы чорныя», «Вуліца шырокая». Спадабаліся і песні на музыку студэнта кансерваторыі В. Помазава ў выкананні квінтэта.

Але найбольшае ўражанне пакінуў вакальна-інструментальны ансамбль інстытута замежных моў «Спектр». Даволі папулярны, ён не мае патрэбы ў прадстаўленні. І рэпертуар яго — любімы ўсімі: «Добры вечар, дзяўчыначка!» І. Лучанка, «Сонечны горад» У. Мулявіна. Шмат песень выканалі будучыя знаўцы замежных моў. Манера іх выканання, рэпертуар, музычнае афармленне— усё гэта адпавядае сучасным патрабаванням. Таму і не дзіўна, што «Спектр» выклікаў такое захапленне ў гледачоў.

Дарэчы, яго ўдзельнікі акампанавалі і на танцах, без якіх не абыходзіцца ні адзін вечар, асабліва — адпачынку. Гэтыя старажытныя і заўсёды юныя танцы...

Калі мы выйшлі з тэатра, то зноў убачылі тых хлопцаў. Але цяпер яны толькі моўчкі праводзілі нас позіркамі, не спытаўшы пра вечар. Напэўна, усё было напісана на нашых тварах...

**Л. АСТАПОВІЧ.**



З кожным годам паляпшаецца паліграфічнае выкананне кніг Выдавецтва БДУ.

Фота Т. Петрашкевіч.

